РАШЭННЕ
метадычнага савета
ДУ «Мінская абласная
бібліятэка імя А.С.Пушкіна»

14 сакавіка 2024 № 1
г.Мінск

Аб выніках абласнога тура
XXXII рэспубліканскага конкурсу
«Бібліятэка – асяродак нацыянальнай
культуры»

Краязнаўства, гісторыка-культурная спадчына з'яўляюцца спрадвечнымі крыніцамі фарміравання нацыянальнай самасвядомасці насельніцтва. З мэтай узмацнення ролі публічных бібліятэк у зборы, захаванні і папулярызацыі інфармацыйных рэсурсаў па краязнаўстве, нацыянальнай гісторыі, літаратуры, мове, народнай культуры, а таксама для падтрымкі і развіцця чытання праводзіцца чарговы тур рэспубліканскага штогадовага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры».

На абласны тур XXXII рэспубліканскага конкурсу-агляду былі прадстаўлены 9 прац ад наступных бібліятэк: Горкаўскай сельскай бібліятэкі ДУК «Чэрвеньская цэнтральная раённая бібліятэка», ДУ «Мінская раённая цэнтральная бібліятэка», ДУК «Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя Анатоля Астрэйкі», ДУК «Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя Паўла Пранузы», ДУК «Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка», ДУ «Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка», Крывічскай пасялковай бібліятэкі ДУ «Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Танка», Мар'інагорскай гарадской бібліятэкі ДУК «Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка», Чурлёнскай сельскай інтэграванай бібліятэкі ДУК «Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Г. Новік».

Матэрыялы, якія былі прадстаўлены на абласны конкурс, уключалі: заяўку, інфармацыйную і аналітычную даведкі аб рабоце бібліятэк за апошнія тры гады, ксеракопію статута ўстановы культуры, дадаткі ў выглядзе інфармацыйна-бібліяграфічных і аналітычных матэрыялаў, рэкламнай і выдавецкай прадукцыі, сцэнарных і электронных матэрыялаў, прэзентацый, відэаролікаў і г.д.

Разгледзеўшы конкурсныя матэрыялы, метадычны савет ВЫРАШЫЎ:

Прызнаць пераможцамі абласнога тура і прадставіць да ўдзелу ў XXXII рэспубліканскім конкурсе «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры»:

У намінацыі «За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем»:

Сярод гарадскіх бібліятэк:

ДУ «Мінская раённая цэнтральная бібліятэка» (дырэктар – Пунінская Аксана Ільінічна) – І месца за рэалізацыю патрыятычнага анлайн-праекта «Листая истории страницы», накіраванага на работу з моладдзю.

ДУК «Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя Паўла Пранузы» (дырэктар – Рыжыкава Аксана Уладзіміраўна) – ІІ месца за арганізацыю выхаваўчай работы з дзецьмі ў рамках праекта «Твой безопасный мир».

Сярод сельскіх бібліятэк:

Чурлёнскую сельскую інтэграваную бібліятэку ДУК «Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Г. Новік» (дырэктар – Пацко Мікалай Мікалаевіч) – І месца за рэалізацыю краязнаўчага праекта «Кросны» (2021–2023).

У намінацыі «За пошукавую і даследчую працу»:

Сярод гарадскіх бібліятэк:

ДУ «Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка» (дырэктар – Гурыновіч Людміла Васільеўна) – І месца за плённую працу па вывучэнні, захаванні і папулярызацыі спадчыны Васіля Віткі, беларускага пісьменніка, крытыка, перакладчыка, заслужанага дзеяча культуры Беларусі.

Сярод сельскіх бібліятэк:

Крывічскую пасялковую бібліятэку ДУ «Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Танка» (дырэктар – Ныргова Таццяна Ананьеўна) – І месца за пошукава-даследчую працу па збору матэрыялаў аб знакамітых земляках – старадаўнім родзе Ходзькаў.

У намінацыі «За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы»:

Сярод гарадскіх бібліятэк:

ДУК «Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка» (дырэктар – Муравейка Людміла Адамаўна) – І месца за рэалізацыю патрыятычнага праекта «Сиреневый код Солигорска».

У намінацыі «За падтрымку і развіццё чытання»:

Мар’інагорскую гарадскую бібліятэку ДУК «Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка» (дырэктар – Андросава Ала Леанідаўна) – І месца за прасоўванне чытання праз рэалізацыю мерапрыемстваў тэатральна-гульнёвай майстэрні «БиблиоТИМ», якая аб’ядноўвае тэатр, лялькі і кнігу.

ДУК «Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя Анатоля Астрэйкі» (дырэктар – Пілат Алена Ігараўна) – ІІ месца за прасоўванне

чытання праз праект «EVENT-бібліятэка. Упрыгожце жыццё чытаннем!».

Сярод сельскіх бібліятэк:

Горкаўскую сельскую бібліятэку ДУК «Чэрвеньская цэнтральная раённая бібліятэка» (дырэктар – Ліфанава Наталля Віктараўна) – І месца за прасоўванне чытання ў рамках аматарскага аб'яднання «Фальклaрыст».

2. Пераможцаў абласнога тура XXXII рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» ўзнагародзіць дыпломамі на абласной школе дырэктара.

3. Па выніках абласнога этапа на разгляд рэспубліканскага аргкамітэту прадставіць працы бібліятэк у наступных намінацыях:

У намінацыі «За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем»: ДУ «Мінская раённая цэнтральная бібліятэка», Чурлёнская сельская інтэграваная бібліятэка ДУК «Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка імя Г. Новік».

У намінацыі «За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы»: ДУК «Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка».

У намінацыі «За пошукавую і даследчую працу»: ДУ «Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка», Крывічская пасялковая бібліятэка ДУ «Мядзельская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Танка».

У намінацыі «За падтрымку і развіццё чытання»: Мар'інагорская гарадская бібліятэка ДУК «Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка», Горкаўская сельская бібліятэка ДУК «Чэрвеньская цэнтральная раённая бібліятэка».

4. Кантроль за выкананнем рашэння ўскласці на загадчыка аддзела бібліятэказнаўства ДУ «Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна» Лаўрык Т.А.

Старшыня метадычнага савета
Мінскай абласной бібліятэкі
імя А.С.Пушкіна Н.М.Вашчыла